# Вяртанне Берасцейскай Бібліі ў грамадскую свядомасць

З 27 верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі распачаўся шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных Берасцейскай Бібліі. Верасень - сімвалічны час, таму што менавіта ў гэтым месяцы кніга пабачыла свет у 1563 годзе.

Нацыянальная бібліятэка, якая падрыхтавала факсімільнае выданне знакамітага помніка, вырашыла правесці вялікі цыкл мерапрыемстваў рознага фармату і для рознай аўдыторыі, каб прадэманстраваць шэдэўр нацыянальнай культуры.

З першай лекцыяй "Берасцейская Біблія: адкрыты дотык" выступіў вядомы даследчык, кандыдат культуралогіі А.А. Суша. У сваёй бліскучай прамове ён абгрунтаваў 30 падставаў для ўшанавання велічнага помніка паліграфічнага мастацтва XVI стагоддзя і 30 прычын для гонару здабыткамі нацыянальнай культуры.

- Інфармацыю пра гэты кніжны помнік у савецкія часы не бачылі ні ў падручніках, ні ў навуковых манаграфіях, - патлумачыў спадар Алесь Суша. - Але гэты помнік не сыходзіў з дыскурсу палякаў, расіян і літоўцаў. Сёння ў поўнай меры пачынаецца вяртанне гэтага помніка беларусамі. 15 гадоў таму ідэя факсімільнага перавыдання Берасцейскай Бібліі падавалася немагчымай з-за слабой матэрыяльнай і паліграфічнай базы. Цяпер гэта адбылося.

Найбольш пераканаўча ў прамове прагучаў адзін з тэзісаў: Мікалаю Радзівілу Чорнаму праз друкаванне Берасцейскай Бібліі ўдалося ўзняць прэстыж свайго роду, веры і краіны. Выразны прыклад мецэнацкай ініцыятывы служыць нам і сёння.



Лекцыю вядомага знаўцы хрысціянскай культуры Беларусі з цікавасцю выслухалі пісьменнікі, мастакі, прадстаўнікі канфесійнага друку, студэнты. Прысутныя выказалі шчырую падзяку даследчыку за нястомную руплівасць па вывучэнні і захаванні скарбаў нацыянальный кніжнай культуры.

- Берасцейская Біблія з'яўляецца сімвалам горада Берасця. Для мяне асабіста і для нашай гісторыі і культуры гэта тэма вельмі важная. Я рады, што з'явілася факсімільнае ўзнаўленне Берасцейскай Бібліі, і што будзе шэраг падзей, звязаных з ушанаваннем гэтага помніка Рэфармацыі, - адзначыў супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН, кандыдат гістарычных навук Андрусь Унучак.

Вяртанне ў грамадскую свядомасць кніжнага помніка будзе працягвацца.

Наведвальнікаў бібліятэкі чакаюць у кастрычніку лекцыі экспертаў і навуковы круглы стол, выстава ў музеі кнігі і майстар-класы па пераплёце, музейныя заняткі для дзяцей і тэатралізаваная пастаноўка.

З 28 верасня да 7 кастрычніка ўсе ахвотныя маюць унікальную нагоду пагартаць факсімільнае выданне Берасцейскай Бібліі.

***Э. Дзвінская.***

На фота: выступае аўтар даследвання "Асэнсаванне шэдэўра" А.А. Суша